Моднікава В.М., сдуд. гр. 104 ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Варановіч І.М.
канд. культуралогіі

# АСАБЛІВАСЦІ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Тэрмін “народная педагогіка” складаецца з двух слоў: I) народная ад слова народ – 1) гэта насельніцтва пэўнай дзяржавы, жыхары краіны; 2) які належыць усяму народу, дзяржаўны; 3) цесна звязаны з народам, уласцівы духу народа, яго культуры, светапогляду; II) педагогіка – навука аб метадах выхавання і навучання.

Народная педагогіка нарадзілась на зямлі разам са з’яўленнем “разумнага чалавека”, з’явілася і развівалася як вынік неабходнасці передаваць ад пакалення да пакалення пэўныя працоўныя веды, умельствы, навыкі, правілы і нормы грамадскіх паводзін.

Чалавек становіцца чалавекам сярод людзей. Французскі філосаф і педагог Л.Сэў адзначае: “Чалавек пры нараджэнні – толькі кандыдат, каб стаць чалавекам. З праграмы яго выспявання, логікі яго росту зусім не вынікае, што ён стане сапраўдным чалавекам. Ён становіцца індывідам у сацыяльным асяроддзі.” Інакш: чалавек – прадукт грамадскіх адносін, галоўнай формай якіх выступае працоўная дзейнасць. Таму натуральна, што гістарычнай падставай узнікнення народнай педагогікі, з’яўляецца праца. Значыць, сувязь выхавання з працоўнай дзейнасцю, з рэальным эканамічным базісам носіць аб’ектыўны характар.

Такім чынам адным з першых метадаў народнай педагогікі з’яўляецца праца. Праца – усвядомленая мэтанакіраваная дзейнасць (чалавек гаспадар зямлі). У беларусаў працоўнае выхаванне пачынаецца амаль з калыскі. Маці брала малое ў поле. Цацкі таксама арыентавалі на працу і рыхтавалі да працы. Навучанне рамяству праз выраб гліняных цацак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гульня – першыя азы азбукі чалавечых зносін. У ёй дзеці вучацца разумець навакольны свет. Гэта першая школа вопыту. У гульні дзіця рэалізуе свае жыццёвыя назіранні, капіруе паводзіны людзей, узнаўляе бачаныя сітуацыі, сямейны побыт, працоўныя заняткі. Гульні развіваюць памяць, спрыт, фантазію.

Танец – фарміруе рухомае, спрытнае, фізічнае выхаванне. Характарызуецца: жыццярадаснасцю, цнатлівасцю, імкненнем да хараства, сюжэтнасцю, мяккім гумарам. Гісторыя, быт, культура знаходзяць свій адбітак у народных танцах, асобныя нацыянальныя рысы характару народа, асаблівасці беларусаў, як абавязковае валоданне нейкай справай, уменнем, кемнасцю, знаходлівасцю, смеласцю. Існуе група танцаў, заснаваных на працоўных рухах і сельскагаспадарчых работах, на нацыянальных рамествах і промыслах: “Мельнік”, “Бульба”, “Лянок”, “Бондар”, “Шаўцы”.

Значнае месца ў працоўным выхаванні людзей належала фальклору (прыказкі і прымаўкі). У іх сканцэнтраваны асноўныя педагагічныя ідэі і вопыт народа, вялізарныя патэнцыяльныя выхаваўчыя магчымасці. Тут таксама падкрэсліваўся накірунак на працу: “Дзе няма ахвоты, там няма работы”, “Для чалавека работа – найлепшы лекар.”

Існаваў яшчэ таксама такі сродак выхавання, як песні. Песні каляндарна-абрадавага цыкла, якія ахоплівалі ўсе бакі жыццядзейнасці земляробаў, вылучылі валачобныя, яскравыя і змястоўныя - своеасаблівыя адбіткі беларусаў.

“Аўдаксею – саху ладзіць…

Аляксею – каня гладзіць…”

У песнях выкарыстоўвалі педагагічныя метады: вітанне, услаўленне, пахвала, заахвочванне, ушанаванне, наказ, парада.

Не менш каштоўны метад народнай педагогікі – прыклад і аўтарытэт. Галоўную ролю ў беларускай сям’і традыцыйна выконваў найбольш вопытны член сям’і. Воля бацькі, маці, старэйшага дзядзькі святая. Гаспадар дома акружаны знакамі пашаны і павагі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метад унушэння – прамое слоўнае уздзеянне выхавальніка на выхаванца калі усё, што унушаецца, бярэцца на веру. (Адлюстравана ў вуснай народнай творчасці “Сарока-варона”).

Перакананне – тлумачэнне неабходнасці прытрымліваццца правіл і паводзін, замацаваных у маральным кодэксе народа.

Парада - калі дзеці звяртаюцца за парадай да бацькоў, вопытных старэйшых людзей. Меркаванні некалькіх чалавек адносна аднаго пытання дазваляюць абраць найлепшае рашэнне.

Благаславенне – наказ на дарогу, пажаданне поспехаў, шчасця ў нейкай справе. Благаславенне на працу, подзвіг, шчаслівае сямейнае жыццё.

Прывучванне – метад выхавання, звязаны з выпрацоўкай пэўных звычак, уменняў. Прывучалі да працы, выканання норм і правіл паводзін.

Для замацавання і ўдасканалення набытых ведаў. Гэты метад абуджае прывычку да разумовай працы, фарміруе працоўныя навыкі, падштурхоўвае да маральнага самаўдасканалення.

Расповед і гутарка – слоўныя метады, слухаючы дарослых дзіця спазнае прыроду і грамадскія з’явы, знаёміцца з гісторыяй маральных патрабаванняў народа, з народнай творчасцю, з асноўнымі відамі працоўнай дзейнасці людзей, са сваім радаводам. Садзейнічае фарміраванню светапогляду, разумоваму развіццю, засваенню маральна-этычных нормаў і патрабаванняў да паводзін чалавека ў грамадстве, выхоўвае найгалоўныя маральныя якасці, дапамагае развіць эстэтычны густ і пачуццё.

Выпрабаванне – метад вопытнай праверкі падрыхтоўкі да жыцця. (У час гульні) Падрыхтоўвала да працоўнай дзейнасці, фарміравала спрыт, сілу, веданне маральнага кодэксу народа, развівала разумовыя здольнасці. Шырока выкарыстоўваліся загадкі, народныя песні, танцы.

Спаборніцтва – імкненне перавысіць адзін аднаго ў дасягненні мэты, майстэрстве, працы, мастацтве. Грамадская думка – сродак і метад народнай педагогікі. Сродак духоўнага ўздзеяння грамадства на паводзіны чалавека, рэгулятар паводзін людзей у грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Клятва – урачыстае абяцанне, запэўніванне. Той, хто дае клятву, нясе вялікую маральню адказнасць. Клятваадступнік – амаральная асоба. Гэта дысцыплінуе і выхоўвае пачуццё абавязку і гонару. У змест клятвы ўкладваецца самае вялікае, дарагое для чалавека, тое, што нельга згубіць. (клянуся табе дзеткамі сваімі).

Заахвочванне. Бацькі пры чужых людзях хваляць дзіця. Гэта выхоўвае пачуццё ўласнай годнасці, а па-другое, робіць згодна маральна-этычных канонаў быць добрым, паслухмяным, старанным, уважлівым і паважлівым.

Асуджэнне (вымова, ганьба) – неўхвала чаго-небудзь або каго-небудзь. Народ асуджае адхіленні ад трывалых норм і правіл паводзін, маральныя заганы. Народ сароміць выпівохаў – “залівах”, гультаёў – “лежань”.

Пакаранне. Народ за разумнае пакаранне. (“Не крычы, а лепей навучы”). Ён супраць цялеснага пакарання (“Розга – не навука”), але ў неабходным выпадку і цялеснае пакаранне не асуджаецца. (“Не слухае ківа, паслухае кія”).

Праклён – выказванне найбольшага раздражэння, злосці і асуджэння с прўнай адмовай ад далейшых зносін.

“Супрадкі” – адбываліся на Беларусі ўсюды ў канун лістапада. Калі сельскагаспадарчыя працы былі скончаны, жанчыны і дзяўчаты збіраліся разам. У час вячорак спявалі песні, распавядалі казкі, былі, нібылічкі, загадвалі загадкі, гулялі ў гульні.

Запалохванне і пагрозы – дзівосная фантастычная форма. Гэта звязана са старажытнімі паганскімі забабонамі і прымхамі народа. (Пра дамавіка, калі дзеці без бацькоў дома).

Народная педагогіка сведчыць аб тым, што багацце народа – гэта не толькі развітая эканоміка, але перш за ўсё высокая нацыянальная самасвядомасць, павага да гісторыі свайго народа, да роднай мовы, культуры, да народных традыцый, звычаяў, абрадаў і свят. Калі ўсё добрае назапашанае народам залажыць у маладым узросце, гэта і застанецца, гэта будзе з кожным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у жыцці. Без ведаў аб шляхах развіцця тэорыі і практыкі выхавання, адукацыі моладзі ў мінулым, немагчыма навуковае выхаванне ў сучасных умовах.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Тлумач.слоўн.бел.літ.мовы: Больш за 65000слоў/ Пад.рэд.М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко; Афармленне А.М. Хількевіча – 2-е выд. Мн. Бел.Эн., 1999. -784с.

2. Арлова Г.П. Беларуская народная педагогіка. – Мінск:Нар.асвета,1993. 120с.

3. Кулiковiч К.А., Грымаць А.А. Гіст.педагогікі: Падручн. для студэнтаў пед.спец.выш.навуч.установ. – Мн.: Выд. Ул.М.Скакун, 2000. – 256с.

4. Грымаць А.А. і інш.: Метад.дапам./А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч – Нар.педагогіка беларусаў/ - Мн:Выд. Ул.М.Скакун,1999 – 256с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ